# НАМ ТРЭБА ВЫРАСЬЦІЦЬ НОВАЕ ПАКАЛЕНЬНЕ РАБОЧЫХ—

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! 12 ЧЭРВЕНЯ 1933 г. № 126 (2003)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

Цана № 5 кап.

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

## здаровых, жыцьцёрадасных, здольных падняць магутнасьць савецкай краіны і абараняць яе грудзьдзю ад нападу ворага (СТАЛІН)

## Фізкультурная арганізацыя БССР Узнагароджана чырвоным сьцягам ВСФК СССР

### Т. т. Гікало, Галадзеду, Чарвякову Закоўскаму, і Герцовічу—пачэсны значок „ГПА“

У сувязі з дзесяцігадовым юбілеем фізкультурнай арганізацыі БССР, прэзыдыум ВСФК Саюзу прыняў спэцыяльную пастанову, у якой адзначае, што дзесяцігодзьдзе фізкультурнай арганізацыі БССР павінна прайсьці пад знакам узьняцьця фізкультурнага руху на яшчэ больш высокую ступень.

ВСФК СССР высунуў перад фізкультурным рухам БССР у якасьці аднэй з важнейшых задач—максымальнае якаснае замацаваньне ўжо дасягнутых посьпехаў і пашырэньне маштабу ахопу шырокіх мас працоўных іспытамі па комплексу „Гатоў да працы і абароны“.

Адзначыушы вялізарныя посьпехі фізкультурнага руху БССР, дасягнутыя за дзесяць год як па якасных, так і па колькасных паказчыках (арганізацыя налічвае каля 100,000 фізкультурнікаў. 43.000 чалавек здала цалкам нормы на значок „Гатоў да працы і абароны“, 150 тыс. чал. ахоплены іспытамі), ВСФК СССР пастанавіў узнагародзіць фізкультурную арганізацыю БССР чырвоным сьцягам ВСФК ЦВК СССР.

У распараджэньне ВСФК СССР адпускаецца 40.000 руб. на канчэньне будаўніцтва усебеларускага клюбу фізкультуры.

За асобыя заслугі і актыўны ўдзел у разьвіцьці фізкультурнага руху БССР, ВСФК СССР пастанавіў узнагародзіць пачэснымі значкамі „Гатоў да працы і абароны“ т. т. Гікало, Чарвякова, Галадзеда, Закоўскага і Гэрцовіча.

Рэдакцыі часопісі „Физкультура и спорт“ прапанавана выпусьціць спэцыяльны нумар, прысьвечаны дзесяцігодзьдзю фізкультурнай арганізацыі БССР.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ